*С. М. Тычына*

# ПРЫЁМ «ПЛЫНЬ СВЯДОМАСЦІ» Ў ТВОРЧАСЦІ А.АДАМОВІЧА

Тэрмін літаратура «плыні свядомасці», як правіла, асацыіруецца з творамі Джэймса Джойса «Уліс», Уільяма Фолкнера «Шум і шаленства», Вірджыніі Вулф «Місіс Дэлоуэй» і інш. У айчыннай літаратуры спецыфічны мадэрнісцкі прыём, які дазваляе непасрэдна ўзнаўляць душэйнае жыццё, паспяхова засвоіў Алесь Адамовіч. Яго аповесць «Карнікі» [2] прадстаўляе перапляценне дакументальнага матэрыялу і непасрэдных перажыванняў, пачуццяў, асацыяцый герояў. У творы арганічна спалучаецца сухая афіцыйная мова разнастайных пратаколаў («2 сентября 1945 года я добровольно возвратился из Франции и в Советской зоне явился в контрразведку, считая, что моя фамилия и мои преступления ей известны» [с.309]), выпісак з асабістых спраў («Тупига Иван Евдокимович, год и место рождения – 1920, деревня Евецко-Николаевка Днепропетровской области. С 1933 года проживал в Белоруссии. Образование – 7 классов» [с.199]), інфармацыі з газет («Один из очевидцев рассказал корреспонденту “Таймс”, что каратели ворвались утром в четверг на 30 автомашинах в лагерь Шатила. Вначале они действовали штыком и прикладом. Хватали женщин и детей, перерезали им горло» [с.445]), з экспрэсіўнымі аповядамі герояў (ці хутчэй «антыгерояў»), думкі якіх прадстаўляе аўтар («Только дурак стал бы верить в ваши здравицы, “письма трудящихся”. <...> Бараны и есть бараны. Но сами псы из псов – кого пригрел, кому имя сделал. Ближайшие! Соратнички! Затаились и ждут, скоро ли руки развяжу им» [с.384]). Значная частка герояў – гэта рэальныя асобы: карнік Тупіга, былыя савецкія афіцэры Сураў, Мураўёў (іх імёны згадваліся ў пратаколах суда над нямецкімі злачынцамі), Гітлер, Сталін і інш. Аднак у творы гучаць галасы не толькі карнікаў, але і іх ахвяр. Так апісваюцца апошнія імгненні жыцця цяжарнай жанчыны, якая болей не ўсведамляе тое, дзе яна знаходзіцца, у якой блытаюцца думкі, для якой застаецца незразумелым тое, чаму яе жыццё, а галоўнае жыццё яе дзіцяці, павінныя перарвацца. Шчаслівыя моманты, якія ўсплываюць у яе памяці, азмрочвае цяжкі пах блізкай смерці. І тут жа пададзеныя адчуванні дзіцёнка, які яшчэ не нарадзіўся і які нічога не ведае, акрамя цяпла і ўтульнасці матулінага жывата. Дзіцёнак яшчэ такі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маленькі (шэсць месяцаў), што саміх думак у яго няма, ёсць толькі адчуванні. І найперш гэта адчуванні непарыўнай сувязі ўласнага жыцця з жыццём матулі.

Найбольш блізкімі да літаратуры «плыні свядомасці» з'яўляюцца эпізоды, звязаныя з цяжарнай жанчынай, Гітлерам і Сталіным. Тут назіраецца і характэрная абрывістасць думак (пераскокванне з адной думкі на іншую, з аднаго ўспаміну на іншы), суб'ектыўнасць, свядомая ненакіраванасць, часавыя напластаванні. Калі гутарка ідзе пра ўнутраныя маналогі гэтых герояў, то часам цяжка зразумець, пра што канкрэтна згадвае герой і ў сувязі з чым узнікае ў яго памяці той ці іншы вобраз. Такая манера аповеда дастаткова часта выкарыстоўваецца, калі пісьменнікі пераказваюць сны герояў ці хочуць прадэманстраваць тое, што чалавек трызніць, моцна хварэе, вар'яцее і інш. Не выпадкова апошняму раздзелу, прысвечанаму маналогу Сталіна, аўтар дае падзагаловак «Сны з расплюшчанымі вачамі». Сны і вочы – неадназначныя сімвалы, якія сустракаюцца на працягу ўсяго твора. Жыццё (асабліва тыя моманты, якія былі звязаныя са злачынствам) ўспрымаецца героямі як сон. Гэта таксама спроба апраўдання – за кашмары не трэба расплачвацца. Але гэты кашмарны для многіх людзей сон галоўныя карнікі ператвараюць у рэальнасць і ім жывуць. Расплюшчаныя ў час сну вочы падкрэсліваюць ненармальнасць, паталагічныя адхіленні ў псіхіцы Сталіна. Герой знаходзіцца на мяжы жыцця і смерці, але працягвае думаць пра сваю ўладу і пра тое, што ён можа кіраваць, распараджацца лёсамі шматлікіх людзей. Вобраз вачэй праследуе не толькі Сталіна («Снова глаза, прямые, колючие, как проволка. Что, не ваш? Не ва-аш, знаю! Не нравлюсь! Снова и снова эти глаза...» [с.387]), але і Гітлера («Снаружи – Они! Глаза льда. Нет, огненные Глаза! Я, только я вижу Их» [с.188]). Менавіта пра вочы сваіх ахвяр часцей за ўсё згадваюць карнікі. Тупіга ловіць насцярожаныя, спалоханыя погляды жанчын, якіх ён зараз будзе расстрэльваць, заўважае вочы дзіцёнка ў калысцы, які адчувае, што Тупіга зробіць яму нешта благое.

У аповесці А. Адамовіча сумяшчаюцца сучаснасць і мінулае. Мінулае (карныя аперацыі, нейкія факты з жыцця герояў) прадстаўлена як тое, што ёсць цяпер, тое, што здзяйсняецца ў дадзены момант. Пратаколы допытаў у судзе прадстаўляюць будучыню герояў, будучыню, ад якой не схаваешся (некаторыя з герояў спрабавалі забыць тое, што яны рабілі, пазбегнуць пакарання). Часам, забіваючы старых, дзяцей, героі ўжо

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадчуваюць, што ім давядзецца адказваць за свае злачынствы, прадчуваюць, што апраўдання за забойствы ім не будзе: «А Тупига сказал и сам услышал, как незнакомо, откуда-то из будущего, прозвучал его голос: “Жалко было, пацана пожалел! Живым сгорит”» [с.236]). У будучыню скіраваныя і апошнія словы аўтара: «Где и кто следующие?» [с.445]). Жорсткія забойствы, бесчалавечныя ўчынкі здзяйсняліся не толькі ў час Другой сусветнай вайны. І аўтар папярэджвае пра тое, што яе заканчэнне не сведчыць пра поўнае знікненне карнікаў, што, на вялікі жаль, гэта не толькі факты гісторыі, ужо далёкага мінулага.

Выкарыстоўваючы прыём «плынь свядомасці» А. Адамовіч спрабуе даследаваць матывы ўчынкаў карнікаў, спрабуе прасачыць ход іх думак, высветліць, якім павінен быць той пераломны момант, калі чалавек перастае быць сціплым, кволым дзіцёнкам, пяшчотным сынам, добрым таварышам, ласкавым мужам, адданым сваёй радзіме і народу патрыётам, а ператвараецца ў злачынцу. Як даказвае аўтар, карнікамі не нараджаюцца. Імі становяцца. Бо ў адных і тых жа ўмовах розныя людзі паводзяць сябе па-рознаму (адны героі спакойна забіваюць, у іншых трасуцца рукі, а нехта адмаўляецца забіваць). Некаторыя героі здзіўляюцца: яны б ніколі не паверылі і раззлаваліся, калі б ім хто да вайны сказаў, што яны будуць расправаўляцца з дзецьмі, з жанчынамі, вынішчаць па загаду вёскі. «А им зачитали странный приказ: об ответственности семей военнослужащих за перебежчиков и сдающихся в плен... Муравьев помнит, что он никак не мог связать этот приказ с собой и своими близкими. Плен? Что за ерунда! Как это возможно?» [с.288]. Даследаванне псіхалогіі карнікаў дае магчымасць убачыць, з-за чаго людзі могуць забыць пра чалавечнасць, мараль: «Об этом берешься писать не потому, что именно тебе известны ответы на “проклятые вопросы” и ты спешишь их огласить, а как раз потому, что мучают и не даются эти вопросы и ответы на них. Нелегко “мысль разрешить”: кто же они – нелюди среди людей, как из человека делают это и что с ним при этом делается...» [с.168]. Сярод прычын, якія штурхаюць герояў уступіць у рады карнікаў пераважаюць наступныя: жаданне выжыць любой цаной, страх таго, што калі не заб’юць яны, то заб’юць іх, і жаданне ўлады над людзьмі. Першае жаданне больш уласцівае для «шараговых» карнікаў – паліцаяў, былых ваеннапалонных, салдат. Апошняе – для «галоўных» карнікаў, якія распачынаюць войны, якія хочуць зламаць волю іншага чалавека, іншых людзей. Аўтар паказвае, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульнымі для ўсіх карнікаў з’яўляюцца недавер, страх, жаданне прынізіць, паздзеквацца з іншага чалавека, пагуляць з ім у кошкі-мышкі (у якасці прыкладу можна згадаць думкі Сталіна пра сваіх падначаленых, якія ціха яго ненавідзелі, але ні слова не маглі сказаць супраць таго, што іх блізкія сядзяць у турме, ці разважанні Тупігі, які прыйшоў у хату для таго, каб знішчыць усіх яе жыхароў (а гэта збольшага жанчыны і дзеці), але ўсё марудзіў, назіраў за сваімі ахвярамі, прадумваў далейшае развіццё падзей).

Выкарыстоўваючы прыём «плыні свядомасці» А. Адамовіч у аповесці спрабуе даследаваць працэс расчалавечвання чалавека. Гэтае даследаванне павінна паспрыяць адказу на важнае пытанне: што можна зрабіць, каб папярэдзіць і прадухіліць з’яўленне карнікаў.


1. *Адамович, А.* Отвоевались! / А. Адамович. – М.: Молодая гвардия, 1990. – 254 с.

2. *Адамович, А.* Хатынская повесть. Каратели: повести / А. Адамович. – Минск: Маст. літ., 2004. – 446 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ